ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА • NO. 29 (3485) • ЧАЦВЕР, 4 ЖНІЎНЯ , 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Ручайкі для вялікай ракі**

Беларусы ўнеслі яркія фарбы ў палітру фестывалю нацыянальных культур Латвіі Стар. 2



**Залацінкі са скарбніцы памяці**

Каб пабачыць класікаў літаратуры зблізку, можна пачытаць успаміны іх дзяцей Стар. 3



**Двое на востраве Пасхі**

Стар. 4

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Фестываль збірае сяброў

## Беларусы Даўгаўпілса на "Вішнёвым фестывалі" ў горадзе Глыбокае падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры з мясцовай адміністрацыяй

У аснове прыгожага свята, што ладзіцца на Віцебшчыне, у горадзе Глыбокае, лёгка разгледзець мясцовыя традыцыі працавітасці, гаспадарлівасці, павагі да каштоўнага досведу жыцця папярэднікаў. Здаўна там раслі вішнёвыя сады: памешчыцкія, а таксама й манастырскія. У тых мясцінах, расказваюць глыбачане, аграном Баляслаў Лапыр вывеў новыя сарты вішняў, якія празвалі "Лапыравы": яны стойкія да беларускіх зімаў, а плады — буйныя, сакавітыя, неверагодна смачныя ды салодкія. Кажуць, з садоў селекцыянера каштоўная вішня й пайшла на мясцовыя сялянскія сядзібы, потым — па ўсім рэгіёне. Дарэчы, родавыя карані па бацьку ва ўдумлівага садавода мясцовыя, з вёскі Рубеж (цяпер Браслаўскі раён), хоць нарадзіўся ён 5 мая 1895 года ў Пецярбурзе. Вучыўся спачатку ў Браславе, сярэднюю школу закончыў у Коўне (цяпер Каўнас, Літва), атрымаў адукацыю агранома ў Пецярбурзе (1916). Працаваў доўгі час павятовым аграномам, у 1926-м ажаніўся з Стэфаніяй Страшэвіч, і ў той жа год маладая сям'я набыла 11 гектараў зямлі каля Глыбокага. Як вядома, на той час то была тэрыторыя Заходняй Беларусі. Расказваюць, Баляслаў Лапыр імкнуўся не толькі несці землякам перадавыя веды (ладзіў па вёсках агранамічныя курсы), але і абуджаць у іх нацыянальную свядомасць. Дзеля таго арганізоўваў фальклорныя гурты, удзельнічаў у тэатральных пастаноўках. Так што "Вішнёвы фестываль" — свайго роду й прыгожы помнік гэтаму цікаваму чалавеку.

I вось ужо чацвёрты фестываль з 18 па 23 ліпеня праходзіў у Глыбокім, прычым наведаў яго і Міністр культуры Барыс Святлоў. Па запрашэнні Глыбоцкага райвыканкама ў свяце паўдзельнічаў ансамбль народнай песні "Купалінка" з Даўгаўпілса, з Цэнтра беларускай культуры. А паколькі сам фестываль стаў магчымым дзякуючы працавітым мясцовым "вішнявадам", то і мы ехалі да іх не толькі спяваць ды танчыць. Маем намер адладжваць з горадам дзелавыя сувязі. Таму і было падпісана паміж установамі Даўгаўпілса і Глыбокага пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры. Як вядома, 2016-ы ў Беларусі — Год культуры. Таму і дзейнасць ЦБК як унікальнай установы ў Прыбалтыцы, што пашырае беларускую культуру, сёлета скіраваная на ўмацаванне сувязяў з установамі культуры Беларусі, на ўдзел у розных беларускіх фэстах і святах, абмен досведам працы.

А досвед наш, падаецца мне, сапраўды варты ўвагі. Як вядома, многія творчыя беларускія гурты з замежжа хацелі б прыехаць, выступіць у Беларусі — нам гэта ўдаецца. Толькі за апошні месяц калектывы ЦБК з поспехам выступалі на інтэрактыўным тэатралізаваным свяце "Купалле" ў вёсцы Экімань (Полацкі раён), на XXV Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", на традыцыйным фестывалі "Перабродская зорка" (Мёрскі раён) ды на "Вішнёвым фестывалі". Мы заключылі два пагадненні аб супрацоўніцтве з аддзеламі культуры двух самакіраванняў у Беларусі.

→ Стар. 4



Гурт "Купалінка" з Даўгаўпілса гасцюе ў Глыбокім



Экзатычны ганчар на "Вішнёвым фестывалі"

ВЕСТКІ

# Паэтка. Асветніца. Педагог

Алесь Мурочак

**Выстава да 140-х угодкаў пісьменніцы Цёткі (Алаізы Пашкевіч) адкрылася ў Мінску**

На станаўленне светапогляду шматгранна таленавітай беларускі паўплывалі і жыццё ў маленстве ў дзеда ў фальварку Стары Двор (цяпер Шчучынскі раён), і вучоба спачатку ў жаночай гімназіі ў Вільні, а потым на вышэйшых адукацыйных курсах Лесгафта ў Пецярбурзе. Апошняе, заўважым, было, калі Піцер ужо круціла ў вірах рэвалюцыйных настрояў. Там у 1904-м дзяўчына экстэрнам здала экзамены за поўны курс у Аляксандраўскай жаночай гімназіі, а як вярнулася ў Вільню, то, пішуць біёграфы, "з галавой акунулася ў рэвалюцыйную работу": стварала рабочыя і жаночыя гурткі, выступала на мітынгах… Пэўна, тая дзейнасць дапамагла і абуджэнню яе паэтычнага таленту.

Ёсць у біяграфіі Алаізы Пашкевіч і Галіцыя: была вольнай слухачкай на філасофскім аддзяленні Львоўскага ўніверсітэта. У 1906-м у Жоўкве, непадалёк ад Львова, выйшлі яе першыя зборнікі вершаў: "Хрэст на свабоду" і "Скрыпка беларуская". А псеўданім Цётка (як знак даверу, цеплыні) упершыню з'явіўся на яе кніжцы "Першае чытанне для дзетак беларусаў", што ў тым жа годзе пабачыла свет у Пецярбурзе. На выставе "Апосталка беларускага адраджэння", якая адкрылася да юбілею пісьменніцы ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі, пададзены прадметы побыту, кнігі, фотаздымкі з часу жыцця пісьменніцы, а таксама цікавыя матэрыялы, ёй прысвечаныя.

РОДНАЕ

# Вышыня Ракуцёўскага лета

Рыгор Арэшка

**Традыцыйнае свята паэзіі ды песні прайшло ў Маладзечанскім раёне — у жывапісных мясцінах, звязаных з імем Максіма Багдановіча**

"Ракуцёўскае лета — 2016" — так называўся вялікі творчы праект. У цёплы, гасцінны куток беларускай зямлі запрасіў гасцей Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Нагадаем, там створаны музейны філіял "Фальварак Ракуцёўшчына", дзе пануе атмасфера шляхецкага фальварка стогадовай даўніны. "Хто ведае, мо няўлоўнае натхненне, што і дагэтуль невычарпальнай крыніцаю струменіць поруч з маладзечанскай вёсачкай, запануе над усімі, хто пройдзецца сцежкамі геніяльнага беларускага паэта", — напісалі ў запрашальніку на свята музейшчыкі.

Якім чынам Ракуцёўшчына ўвайшла ў жыццё Максіма Багдановіча, 125-я ўгодкі якога сёння шырока адзначаюцца? Улетку 1911-га, пасля амаль 15-гадовага расстання з Бацькаўшчынай, Максім Багдановіч вярнуўся на беларускія землі. Пабываў спачатку ў Вільні. Сябры-нашанііўцы паэта паспрыялі таму, што прыветным, цёплым, утульным куточкам, дзе ён правёў два летнія месяцы, стала Ракуцёўшчына. Там, у ваколіцах фальварка шляхціца Вацлава Лычкоўскага (гэта — родны дзядзька Івана і Антона Луцкевічаў па маці) Максім Багдановіч знайшоў сапраўдную крыніцу для натхнення — жыццё беларускай вёскі. Усюды мілагучна гучала родная мова, якой паэт імкнуўся дасканала авалодаць. Натхнялі яго й водары лугоў, бруенне крыніц, шапаценне лясоў, птушыныя спевы… Усё тое, заўважым, ёсць у Ракуцёўшчыне і сёння, а ў 1911-м, ды і пазней вершамі, вобразамі, рыфмамі адгукалася ў душы паэта. І лёгка ліліся з чуйнага сэрца, перапоўненага вечнай паэзіяй жыцця, вершы. А неўзабаве тоўсценькі сшытак, спярэшчаны раўнюткім почыркам, стаўся асновай зборніка вершаў Максіма Багдановіча "Вянок". Менавіта побыт у Ракуцёўшчыне і падарожжа да яе дапамаглі Максіму яшчэ глыбей акунуцца ў глыбіні беларускай гісторыі, сапраўднага вясковага жыцця з новымі яго сябрамі, суседзямі, вяскоўцамі. І з такой чароўнай летняй прыродай.



Ракуцёўшчына памятае Максіма Багдановіча

У Ракуцёўшчыне ў мінулыя выхадныя спачатку прайшла прывітальная імпрэза ля памятных камянёў; потым — літаратурна-музычнае свята з удзелам вядомых дзеячаў культуры і мастацтваў краіны, празаікаў, паэтаў і бардаў.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# Ручайкі для вялікай ракі

## Беларусы ўнеслі яркія фарбы ў палітру фестывалю нацыянальных культур Латвіі

Лета — цудоўная пара для розных фэстаў. Вось і ў Даўгаўпілсе, розных гарадах Латгаліі прайшоў першы Фестываль нацыянальных культур Латвіі "Pynu, pynu sītu" — ён задуманы, каб пашыралася, развівалася багацейшая культурная і самабытная спадчына ўсіх нацменшасцяў, якія жывуць у Латвіі.

Фестываль сабраў каля 1400 удзельнікаў. На ўсіх канцэртных пляцоўках горада гучалі песні, танцавалі розныя гурты. Сярод іх і калектывы даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры: ансамбль народнай песні "Купалінка" і танцавальны "Лянок". Выступалі яшчэ ансамбль народнай песні "Надзея" з Рыгі, ансамбль "Аколіца" (Дагда), фальклорны гурт "Лянок" (Елгава), екабпілскі ансамбль "Завіруха", ансамбль песні "Паўлінка" з Ліепаі, рэзэкненскі ансамбль "Сузор'е". Асаблівыя апладысменты і захапленне гледачоў заслужыў фальклорны гурт "Сунічкі" з Віцебскай вобласці.



Прыгожа, крэатыўна выступалі на фестывалі беларускія гурты

На працягу некалькіх фестывальных дзён беларуская творчая група ўдзельнічалі ў розных майстар-класах, самі праводзілі заняткі па вырабе лялькі-абярэга. Іх у Цэнтры беларускай культуры ладзіла ўдзельніца ліепайскай "Паўлінкі" Ірына Бяляева. Шматлікія госці з цікавасцю слухалі яе аповед пра гісторыю лялькі, яе ролю ў жыцці чалавека. Ірына паказала сваю калекцыю лялек: усё зроблена яе рукамі. А потым усе разам, дарослыя і дзеці, вучыліся рабіць ляльку-абярэг пад кіраўніцтвам майстрыхі. Вакальны гурт "Паўлінка" праявіў сябе ў "музычным трамвайчыку", які курсіраваў на другі дзень фэсту: артысты для пасажыраў спявалі песні на беларускай мове.

Субботняя раніца, 2 ліпеня. На пляцоўцы "Беларускі двор" у Даўгаўпілскай крэпасці ўсе творчыя беларускія гурты з Латвіі, Беларусі некалькі гадзін радавалі гараджан і гасцей сваімі выступленнямі. Некаторыя нават спявалі ды танцавалі разам з артыстамі. Пасля абеду дзеі адбываліся ў парку Дубровіна, дзе канцэрты праходзілі адначасова на трох пляцоўках. "Купалінка" і "Лянок" спявалі-танцавалі каля музея, паказаўшы другую праграму. Вечарам усе артысты аб'ядналіся ў святочным шэсці. Па вуліцы Рыгас на плошчу Віенібас прайшла шматнацыянальная калона са сцягамі, штандартамі. З вітальнымі словамі да ўдзельнікаў фэсту звярнуўся прэм'ер-міністр Латвіі М. Кучынскіс, мэр Даўгаўпілса Я. Лачплесіс. Пераходны сцяг фестывалю нацыянальных культур Латвіі ад Даўгаўпілса пераняла Елгава: там у 2018-м пройдзе другі па ліку фестываль. Дарэчы, у Беларусі Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у Гродне праводзіцца ўжо даўно.

Культуру называюць падмуркам грамадства. Яго ўмацаванню, несумненна, служыць і фестываль "Pynu, pynu sītu" (радок з латгальскай песні, даслоўна: "Пляту, пляту сіта"). Сваім удзелам, яркімі выступленнямі мы, беларусы таксама ўмацоўваем падмурак таго грамадства, у якім жывём. А яшчэ танцамі й песнямі дорым людзям добрыя, шчырыя і станоўчыя эмоцыі, цудоўны настрой.

Цэнтр беларускай культуры выказвае словы падзякі валанцёрам, якія два дні, з ранку й да вечара дапамагалі беларускім гуртам утульна пачуваць сябе ў Даўгаўпілсе. Добра папрацавалі прадстаўнікі ЦБК Жанна Раманоўская, Ірына Якушонак, Марыя Памецька, Настасся Малышава, Інэса Казлоўская, Марына Медунецкая, а таксама актывісты суполкі "Уздым" Таццяна Дзянісава, Валеры Амбросаў.

**Марыяна Міхалевіч,**
г. Даўгаўпілс

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Па адзенні сустракалі

## У Дні нацыянальнага касцюма, што праходзілі ў Малдове, паўдзельнічалі актывісты беларускай дыяспары

Дзень нацыянальнага касцюма сёлета ў Малдове афіцыйна адзначалі ўпершыню: у Палацы Рэспублікі. Гэта цяпер — нацыянальнае свята. На яго адкрыцці былі прэм'ер-міністр Малдовы, міністр культуры, іншыя прадстаўнікі ўлады, а таксама дыпламаты, акрэдытаваныя ў Малдове, прадстаўнікі этнакультурных суполак краіны. Свята, мяркуецца, паспрыяе таму, каб у грамадстве больш цаніліся сапраўдныя каштоўнасці з культурнай спадчыны. Паколькі нацыянальнае адзенне — гэта, як цяпер кажуць, брэнд ідэнтычнасці, сімвал, які нас прадстаўляе ў свеце (гэтаксама як герб, сцяг, гімн…), то і святкаванне ўключала дэманстрацыю самабытных народных касцюмаў. Кожны ахвочы мог пабачыць прадметы нацыянальнага адзення прадстаўнікоў розных народаў, што жывуць у Малдове. Да таго ж рабіліся паведамленні пра сімволіку кампанентаў народнага касцюма, пра тэхнікі яго вырабу.

Праходзіў вялікі паказ традыцыйных народных касцюмаў народаў Малдовы: як з музейных калекцый, так і з прыватных збораў. Можна было шмат цікавага даведацца пра гісторыю нацыянальных касцюмаў, значэнне вышытых на іх знакаў. Звярталася ўвага на адметнасці, на тое, што ўпрыгожвае такое адзенне. У паказе паўдзельнічала і Беларуская грамада Малдовы, у беларускія строі апранулюся сябры суполкі Д. Нікіцін і Н. Гаўрылава. Дарэчы, выглядалі нашы сябры вельмі прыгожа і дабротна, і было шмат ахвочых з імі сфатаграфавацца. Потым беларусы атрымалі падзяку, віншаванне ад міністра культуры. Я ж распавядаў тэлежурналістам, што наш нацыянальны касцюм карані мае ў далёкай даўніне, калі ежа, адзенне, а па вялікім рахунку і само жыццё нашых продкаў былі моцна "падвязаны" да земляробства і жывёлагадоўлі. Вось таму і сёння ў беларускім касцюме, арнаменце ёсць, напрыклад, сімвалы-вобразы Ярылы, язычніцкага бога ўрадлівасці і жыццёвых сіл прыроды, якога прасілі пра добры ўраджай. Спецыялісты "чытаюць" ва ўзорах таксама вобразы Вялікага Сонца, Маці Зямлі-карміцелькі ды Хлеба.

Каб чытаць узоры, сімвалы на беларускіх строях — трэба іх вывучаць, звяртацца да спецыяльнай літаратуры. Звычайна ж вышывалі ўзор, скампанаваны з кругоў і квадратаў (што сімвалізавала Сонца і Зямлю), ёсць у вышыванках матывы вады, ракі (гэта як папярэчныя поласы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), ёсць сімвалы лесу, лугу (кветкі, птушкі, дрэвы). Каханне звычайна сімвалізуе дзяўчына з узнятымі рукамі, якая трымае каласы і кветкі. Вобраз сям'і "шыфраваўся" як чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі. А вось крыж з чатырох квадратаў — гэта сімвал продка, роднага дзеда таго, хто носіць строй.



З беларусамі многія хацелі сфатаграфавацца

На свяце выступалі розныя артысты, фальклорныя гурты. Наведнікі змаглі паўдзельнічаць у творчых семінарах, пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні. Праходзілі таксама тэматычныя паказы такіх убораў, як "тэзаўрус" — з калекцый музеяў, "госць" — з прыватных калекцый, "касцюмы сучаснасці" — дэфіле калекцый, створаных дызайнерамі ў этнафальклорным стылі, "куфар" — экспанаты з куфэркаў для пасагу некаторых вядомых асоб. А на паказе "амбасадар" нават акрэдытаваныя ў Малдове дыпламаты — звычайна то былі муж і жонка — дэманстравалі традыцыйныя касцюмы сваіх краін і народаў.

**Юры Статкевіч,**
старшыня Беларускай грамады ў Малдове

ВЕСТКІ

## Шчасце жыць

**Іван Іванаў**

**У Беларусі ўпершыню прайшоў конкурс "За жыццё" сярод медыкаў і арганізацый аховы здароўя. Падведзены яго вынікі.**

Часам гамлетаўскае пытанне "быць ці не быць" у пэўных жыццёвых абставінах гучыць як "жыць ці не жыць". І вырашаць яго цяжарным жанчынам, што звяртаюцца да спецыялістаў, вельмі няпроста. Што ж, ім патрэбна дапамога! І вопытныя спецыялісты засцерагаюць тых, хто носіць пад сэрцам новае жыццё, ад неабачлівых крокаў. Можна смела казаць, што кожнае ўратаванае жыццё — бясцэннае. Пра тое ішла гаворка на нядаўнім рэспубліканскім семінары. Ён праходзіў у Мінску на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра "Маці і дзіця".

Спецыялісты падзяліліся досведам работы кабінетаў перадабортнага кансультавання, псіхалагічнымі тонкасцямі гэтай справы, у тым ліку асаблівасцямі працы з падлеткамі па пытаннях сексуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя. У семінары ўдзельнічалі акушэры-гінеколагі, педыятры, псіхолагі, а таксама прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы.



Ранішняе сонейка

Пасля заканчэння семінара прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і намінантаў рэспубліканскага конкурсу "За жыццё", на якую былі запрошаны і журналісты. Конкурс упершыню праводзіўся ў Беларусі на пачатку года сярод акушэраў-гінеколагаў і псіхолагаў, а таксама арганізацый аховы здароўя. Вызначаны спецыялісты, арганізацыі, якія, гаворыцца ў прэс-рэлізе, "умела вядуць працу па прафілактыцы абортаў, павелічэнні нараджальнасці, скарачэнні колькасці штучных абортаў, падрыхтоўцы моладзі да сямейнага жыцця і захаванні дарадавага здароўя". Пераможцы атрымалі каштоўныя прызы.

Арганізавалі конкурс "За жыццё" Міністэрства аховы здароўя і Дабрачынны фонд імя Прападобнай Еўфрасінні Полацкай. А найважнейшы вынік конкурсу — гэта выяўленне матэрыялы, праекты, многія з якіх вартыя пашырэння ў сферы аховы здароўя.

Нагадаем, што ўпершыню акцыя "Падары мне жыццё!" з мэтай папярэджання абортаў у краіне прайшла ў 2011 годзе. Тады былі задзейнічаны СМІ, метады міжасобасных зносін, у тым ліку трэнінгі.

У 2013-м у асобных рэгіёнах краіны пры падтрымцы Праваслаўнай царквы, абласных выканкамаў у паліклініках, жаночых кансультацыях адкрыліся кабінеты "За нараджэнне". А ў 2014-15 гадах па краіне прайшла акцыя "Разам у абарону жыцця".

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

# Залацінкі са скарбніцы памяці

## Каб пабачыць класікаў літаратуры зблізку, можна пачытаць успаміны іх дзяцей

**Людміла Малей**

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі прэзентаваліся адразу два выданні: "Янка Маўр. Выбранае" і кніга ўспамінаў дачкі пісьменніка Наталлі Міцкевіч "Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа". Адкрылася кніжна-дакументальная выстава "Літаратурныя шляхі Якуба Коласа і Янкі Маўра", невялікая фотавыстава з асабістага архіва Міхася Міцкевіча — сына Якуба Коласа і зяця Янкі Маўра. Сабраліся нашчадкі Янкі Маўра і Якуба Коласа, пісьменнікі, навукоўцы, прадстаўнікі выдавецтваў, супрацоўнікі бібліятэкі, журналісты. На скрыпцы, якая належала ў свой час Якубу Коласу, іграў Павел Бацян, лаўрэат міжнародных конкурсаў і Спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Вёў імпрэзу пісьменнік Генрых Далідовіч.


ЛЮДМІЛА МАЛЕЙ

Міхась Міцкевіч прымае падарункі ад Анатоля Валахановіча

Пра кнігу "Янка Маўр. Выбранае" расказала яе ўкладальніца, унучка Янкі Маўра і Якуба Коласа Марыя Міцкевіч. А невялічкую прадмову да кнігі напісала Васіліна Міцкевіч, яе дачка. У кнігу, што пабачыла свет у серыі "Беларускі кнігазбор", увайшлі аповесці "Шлях з цемры", "У краіне райскай птушкі", "Палескія рабінзоны", "Фантамабіль прафесара Цыляркоўскага", некаторыя апавяданні, артыкулы, эпісталярная спадчына Янкі Маўра. У дадатку — успаміны пра пісьменніка ды вершы, прысвечаныя яму. Некаторыя лісты, артыкулы з цыкла "Старонкі гісторыі" надрукаваны ўпершыню.

Цікава расказвала Марыя Міцкевіч пра тое, як жыў, працаваў свае кнігі Янка Маўр. Напрыклад, пішучы прыгодніцкую аповесць "У краіне райскай птушкі", ён дасканала вывучыў многія крыніцы, у якіх пісалася пра Новую Гвінею: энцыклапедыі, часопісы, "Падарожжы Міклухі Маклая". Пісьменнік добра ведаў міжнародную мову эсперанта, нават вёў на беларускім радыё курсы па яе вывучэнні. На эсперанта ў яго была і перапіска з карэспандэнтамі з розных краін, што дапамагала яму ў працы над творамі. Скажам, для кнігі "Амок" атрымліваў каштоўныя матэрыялы ад эсперантыстаў з розных краін, нават з Чылі. У творах Янкі Маўра дакладна апісаны падзеі, навакольны свет іншых краін — іх карэнныя жыхары не верылі, што аўтар там ніколі не бываў.

Але больш, чым замежжа, любіў пісьменнік родную зямлю. Аповесць "Палескія рабінзоны" ўпершыню выйшла ў 1935-м, трапіла ў Беларусі ў шэраг самых папулярных твораў. Шмат разоў перавыдавалася, на розныя мовы перакладзена, нават на кітайскую, на рускай выйшла ў 1958 годзе. Янка Маўр пераконваў чытачоў, што ў Беларусі ёсць шмат куткоў, не горшых ад заморскіх. Пісаў: "Ёсць




пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца морамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры". Дарэчы, "Палескіх рабінзонаў" з захапленнем чытала-перачытвала і я сама ў дзяцінстве. Калі падрос мой сын, таксама не мог ад кнігі адарвацца, нават забываўся на ўрокі. Цяпер кніжка на паліцы чакае маю пяцігадовую ўнучку. Вось так праз цікавую кнігу і ладзіцца сувязь пакаленняў, паяднаных любоўю да сваёй краіны.

Між тым жыццё Янкі Маўра было цесна спалучана з жыццём Якуба Коласа. Не толькі сябры яны былі, але і сваты, таму заўсёды падтрымлівалі адзін аднаго. Пра цёплыя стасункі сведчаць вершы, якія прысвяціў Якуб Колас Янку Маўру: "Дай, Божа, прыбытку, дабра майму свату,/ Няхай ідзе радасць у яго хату". Пісьменнік Уладзімір Ліпскі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра, галоўрэд часопіса "Вясёлка", адзначыў: іх жыццё — прыклад сапраўднага сяброўства. Калі Янку Маўра літаратуразнаўцы вызначаюць як беларускага Жуля Верна, то ролю ў літаратуры Якуба Коласа — як беларускага Гамера, бо стварыў ён нацыянальную "Іліяду" і "Адысею": "Новую зямлю" і "Сымона-музыку".

Кнігу ўспамінаў "Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа" напісала Наталля Міцкевіч — дачка Янкі Маўра, яна ж і жонка малодшага сына Якуба Коласа. У кнізе, якая пабачыла свет у Выдавецкім доме "Звязда", знаходзім цікавыя факты з жыцця класікаў, паказаны іх узаемадачыненні, стасункі з роднымі, сябрамі, знаёмымі. Аўтарка расказвае пра сябе, сваю сям'ю, распавядае пра сустрэчы са знакамітымі людзьмі. На жаль, не дачакалася яна выхаду кнігі цалкам, часткамі ж — друкавалася пры яе жыцці ў часопісе "Полымя". Пра тое казаў яго тагачасны галоўрэд Мікола Мятліцкі. Прэзентаваць выданне давялося Міхасю Канстанцінавічу, які казаў, што дапамагаў жонцы, рэцэнзаваў кнігу, дадаў у яе трошкі гумару. Коласаў сын згадаў некаторыя цікавыя жыццёвыя гісторыі, якія здарыліся ў сям'і. Менавіта ён у дзяцінстве, дарэчы, паслужыў правобразам лірычнага героя коласаўскай паэмы для дзяцей "Міхасёвы прыгоды". Напрыканцы імпрэзы Анатоль Валахановіч — пісьменнік, гісторык, журналіст, краязнавец — перадаў Міхасю Міцкевічу ў падарунак свае кнігі.

Безумоўна, біяграфіі класікаў літаратуры будуць заўсёды прыцягваць увагу, іх даследуюць вучоныя, дзеляцца ўспамінамі сябры. А дзеці, унукі класікаў могуць расказаць, якімі яны былі ў побыце, сям'і, як зносіліся з рознымі людзьмі, з кім сябравалі, каго любілі, як пісалі свае творы. І хто ж, як не блізкі сваяк, можа найлепш пра тое напісаць! І таму такія кнігі памяці — асабліва каштоўныя.

**АДРАСЫ ДРУЖБЫ**

# Праз вершы раскрываецца душа

**Сяргей Шычко**

**У туркменскай літаратурна-мастацкай газеце "Эдэбіят ве сунгат" ("Літаратура і мастацтва") надрукавана падборка вершаў беларускіх паэтаў у перакладзе на туркменскую мову**

Адкрываецца публікацыя ўступным словам галоўнага рэдактара выдання — Хемрагулы Худайкуліева. Пісьменнік расказвае пра сёлетні візіт Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава ў Беларусь, пра адкрыццё амбасады Туркменістана ў Мінску. Гаворыць і пра тое, што ў беларускай і туркменскай паэзіі усталяваліся даўнія сувязі. Дарэчы, бываючы ў Мінску, у Выдавецкім доме "Звязда", Хемрагулы Худайкуліеў пазнаёміўся з беларускімі паэтамі Міколам Мятліцкім і Адамам Шостакам.

Паэтычную частку адкрываюць вершы Міколы Мятліцкага (усяго іх — тры) у перакладзе Атамурада Атабаева. Змешчаны і пераклад двух вершаў Міколы Шабовіча (перакладчык — Сулейман Іламанаў), а таксама тры творы Юліі Алейчанкі (перакладчыца — Лагун Пураева) і два — Адама Шостака ў перакладзе Сейтмурада Гельдыева.


ІВАН ЖДАНОВІЧ

Туркменскія студэнткі

Нагадаем, што ў розныя гады ў газеце "Эдэбіят ве сунгат" друкаваліся беларускія творцы Янка Брыль, Алесь Бадак, Мікола Калінковіч, Пімен Панчанка, Алесь Карлюкевіч, Міхась Карпенка ды іншыя. Творы іх перакладалі на туркменскую мову Какабай Курбанмурадаў, Керым Курбанняпесаў, Мамед Сеідаў, Атамурад Атабаеў ды іншыя майстры прыгожага слова з братняга Туркменістана.

Газета "Эдэбіят ве сунгат" праяўляе цікавасць да Беларусі, яе культуры, літаратуры. У розныя гады яна расказвала на сваіх старонках пра Янку Купалу, Барыса Мікуліча, Якуба Коласа, Аркадзя Марціновіча ды іншых мастакоў слова з Беларусі.

Відавочна, ужо даўно наспела патрэба прысвяціць беларускай літаратуры адмысловы, спецыяльны выпуск выдання. Бо сяброўства беларускага і туркменскага народаў умацоўваецца, а сумесных літаратурных, культурных праектаў, сустрэч — усё больш. У прыватнасці, летась у снежні, калі быў афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Туркменістан



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Беларуска-туркменскі дыялог у Ашхабадзе

і ў Ашхабадзе праходзіла вялікая Беларуска-туркменская выстава, Дні культуры Беларусі, там былі і беларускія пісьменнікі, журналісты. Па ініцыятыве беларускага боку ў адной з тэлестудый, размешчанай высока ў гарах, прайшоў беларуска-туркменістанскі круглы стол — пра тое падрабязна пісалі журналісты Іван і Валянціна Ждановічы ў часопісе "Беларусь. Belarus" у падарожным нарысе "Высокая зорка сяброўства" (2016, №4) У прыватнасці, пад час той сустрэчы была агучана ідэя: "Было б цікава выдаць беларуска-туркменска-рускі зборнік вершаў пра любоў да радзімы паэтаў Беларусі ды Туркменістана. Параўнаць, якія вобразы ажыўляюць творчасць, патрыятычныя пачуцці і думкі прадстаўнікоў двух народаў". І нашы туркменскія сябры гаварылі: у іх выдаюцца творы беларускіх пісьменнікаў — і класікаў, і сучаснікаў. Яны зацікаўлены ў тым, каб літаратура брацкага народа была прадстаўлена ў Туркменістане яшчэ шырэй.

**КАРЫСНЫ ДОСВЕД**

# Фестываль збірае сяброў

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Вось і пад час “Вішнёвага фестывалю” начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама Таццяна Тарасевіч і кіраўніца даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры Жанна Раманоўская ўрачыста, у прысутнасці работнікаў устаноў культуры Глыбоччыны, падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве: гэтак мы ў Год культуры замацавалі ранейшыя дамоўленасці, планы.

І ў нашых дзелавых партнёраў, мы пераканаліся, цікавых, крэатыўных ідэй вельмі шмат. Яны ж і ўвасабляць задумы ўмеюць прыгожа! Вось і “Вішнёвы фестываль” — гэта спроба вярнуць Глыбокаму славу горада-сада. Маштаб, размах праграмы здзіўляе. Штодзень — свая тэматыка, адметнасць. Спачатку быў Дзень грамадскіх аб’яднанняў “Вішнёвая энергія”; потым Дзень спорту “Алімпійская вішня”; 20 ліпеня — Дзень моладзі “Вішнёвая феерыя”; 21-га — тэматычная праграма “Паэтычны вішнёвы дворык”; 22-га — тэматычная праграма “Этна-вішня”; і ўрэшце праграма “Вішнёвы край”, закрыццё фэсту.

Наша “Купалінка” з яркай праграмай паўдзельнічала ў заключных імпрэзах, якіх было шмат. Гэта і незабыўнае святочнае шэсце “У гасцях у вішні” на чале з Вішнёвай каралевай, адкрыццё скульптуры “Сям’я” на Цэнтральнай плошчы (з удзелам Міністра культуры Барыса Святлова), канцэрт жывой музыкі, урачыстая рэгістрацыя “Вішнёвага вяселля”, канцэрт замежных гасцей “Вянок дружбы”... Ладзіліся яшчэ выстава жывапісу, выстава-дэгустацыя кулінарных вырабаў, прэзентацыя калекцыі льнянога адзення, майстар-класы, працавалі вулічны гандаль, дыскатэка, быў святочны салют і шмат чаго іншага. Так што ўражанні ў даўгаўпілсцаў — незабыўныя. Нам пашчасціла — і тут да месца гэтае слова! — не толькі падарыць гораду выдатныя песні, танцы, але і прадэгуставаць знакамітую вішню, купіць сувеніры “з вішанькай”, прагуляцца па гасцінным гарадку. У цэнтры якога, дарэчы, вельмі прыгожае возера з фантанам. Мы і сфатаграфаваліся каля сімвала горада, кампазіцыі “Вішанька”: двухметровая цыліндрычная тумба (яе стварыў віцебскі скульптар Іван Казак), стылізаваная пад дрэва, якое вянчае галінка са спелымі вішнямі.



Прагуляцца па святочным горадзе — адно задавальненне



На “Вішнёвым фестывалі” была і Вішнёвая каралева

Як бачым, “Вішнёвы фестываль” — яскравы прыклад таго, як раённы горад, выкарыстоўваючы свой прыродны рэсурс, можа стварыць культурную падзею міжнароднага ўзроўню. Гэта цікава і мясцоваму люду, і турыстам, ёсць дзе разгарнуцца мясцовым прадпрымальнікам. Кожны змог паўдзельнічаць у гашэнні паштовай маркі “Вішнёвага фестывалю”, прадаваліся сувеніры з сімволікай “ВФ”: гадзіннікі, талеркі, кубкі, магніцікі, блакноты, футболкі, падушачкі, бірулькі, сумкі... Нават знакаміты Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат пашырыў лінію прадукцыі ды выпусціў згушчонку са смакам вішні! Так што, калі казаць прафесійнаю моваю, праведзена велізарная маркетынгавая праца па стварэнні ўнікальнага брэнду. Кажуць, паглядзеўшы на такі досвед суседзяў, і ў Шаркаўшчыне вырашылі зрабіць свой фестываль: яблычны. Што ж, добрыя ідэі “даюць прыплод”, а самі глыбаччане шчодра дзеляцца ведамі з сябрамі. У іх ліку цяпер і наш ЦБК, які восенню ўжо шосты раз будзе праводзіць свой Міжнародны фэст народнай культуры “Беларускі кірмаш”. Дарэчы, ужо запрошаны на яго і творчы гурт з Глыбокага.

Цяпер офіс ЦБК упрыгожвае гадзіннік “Вішнёвы фестываль”, на стэндзе ўзнагарод — фестывальны дыплом, выставу папоўніў фірменны кубак, а бібліятэку — прыгожая кніга пра Глыбоцкі край. Падарункі атрымала дэлегацыя Даўгаўпілса пад час падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве паміж аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама і даўгаўпілскім Цэнтрам беларускай культуры, а таксама на цырымоніі закрыцця “Вішнёвага фестывалю”.

Цэнтр беларускай культуры выказвае падзяку за запрашэнне, сардэчны прыём старшыні Глыбоцкага райвыканкама Алегу Морхату, начальніцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Таццяне Тарасевіч, супрацоўніцам аддзела Людміле Карніловіч, Таццяне Мацюшонак, а таксама Генеральнаму консулу Беларусі ў Даўгаўпілсе Уладзіміру Клімаву за візавую падтрымку.

**Марыя Памецька,**
Глыбокае — Даўгаўпілс

**ДАЛЁКІ БЕРАГ**

# Двое на востраве Пасхі

Магчыма, сталыя чытачы газеты памятаюць артыкул “Дзе кіне якар капітан?” — гэта пра тое, хто я і адкуль. Там ёсць такі ёмкі падзагаловак: “Пётр Рабко пабываў на сваёй яхце “Педрома” ў 48 краінах свету”. (Артыкул — у інтэрнэце, у архіве на нашым сайце: ГР, 03.09.2009 — **Рэд.**). І калі тэкст быў надрукаваны, то, чытаючы яго, я думаў: мы з маёй мілаю жонкай Гінай будзем працягваць наша плаванне на маленькай яхце — усяго 8, 87 метра — вечна. Гэта значыць: сто гадоў... Хадзілі мы па марах-акіянах разам 15 гадоў, прайшлі не так ужо і шмат: 30312 марскіх міль. Дарэчы, даўжыня зямнога экватара складае 21600 міль. Але ўсяму ў жыцці — свой час. І асаблівая мудрасць ёсць у тым, каб, разлічыўшы свае сілы, своечасова сысці “на бераг”. Тое тычыцца, дарэчы, не толькі мора... І вось Гіна мне неяк сказала: відаць, ужо хопіць нам марскога жыцця, пара на сушу перабірацца.

Нялёгка было прыняць такое рашэнне, але — трэба. І мы сабе збудавалі, вобразна кажучы, новае судна для падарожжа па жыцці:



Гіна і Пётр на востраве

гэта невялічкі домік, тыпу садовага (яго тут называюць кабанья...) у Паўднёвай Амерыцы, у Чылі. Чаму там, спытаеце? Бо гэта — побач з домам Франчэскі, дачкі Гіны, у 18 кіламетрах ад горада Кансепсьён. Дарэчы, муж Франчэскі — вучоны-вулканолаг, выкладае ва ўніверсітэце. А горад памятае і слыннага беларуса Ігнацы Дамейку, у нэце знаходзім: “Ігнацы Дамейка на пачатку 1845 года адправіўся ў Кансепсьён — гэта своеасаблівая брама ў Araўканію. Вучоны апісаў даліны рэк Рыа-Будзі і Рыа-Куэле. Адначасна, акрамя асноўных геолага-мінералагічных і геаграфічных даследаванняў, Ігнацы Дамейка старанна вёў этнаграфічныя назіранні за жыццём індзейцаў. Агульная працягласць маршруту склала 500 кіламетраў”. Увогуле вялікага беларуса Дамейку ў Чылі па гэты час вельмі шануюць.

Мы — на сушы жывём, аднак мора ўсё ж прыцягвае да сябе. І адно з нашых апошніх плаванняў, ужо ў якасці пасажыраў, мы здзейснілі летась, у канцы лістапада. Пабывалі на чылійскім востраве Рапа-Нуі (яго яшчэ называюць востраў Пасхі). Натхніла нас на такую вандроўку міжнародная экспедыцыя на плытах “Кон-Цікі 2” — пра яе можна пачытаць у інтэрнэце. Дарэчы, на востраве Пасхі быў мой 342-й марскі порт. Не прэтэндуючы на Кнігу рэкордаў Гінеса, скажу: я — адзіны капітан з




ПЁТР РАБКО

Ля гатэля на востраве Пасхі — беларускі сцяг

Клайпеды (там закончыў мараходнае вучылішча і доўга працаваў на марскіх судах), які мае такі багаты “ліст партоў”. Дадам яшчэ, што аддаў я любімаму мору ажно 59 гадоў жыцця. Хадзіў па марах-акіянах пачынаючы з 1956 года: першая плавальная практыка была з савецкага порта Калінінград да савецкага ж порта Уладзівасток.

І хаця мы з Гінаю і не дачакаліся на востраве з’яўлення экспедыцыі “Кон-Цікі 2”, аднак цудоўна правялі там час. За тыдзень выхадзілі, аб’ездзілі ўвесь невялікі востраў, на якім жыве больш за 5000 чалавек. І там у гонар нас быў узняты сцяг Рэспублікі Беларусь. Хоць я з памежнай Чарнігаўшчыны, аднак люблю Беларусь, лічу сябе беларусам: бацька аддаў жыццё, вызваляючы ад фашыстаў Беларусь у 1944-м. Ён пахаваны ў вёсцы Давыдаўка на Гомельшчыне. Менавіта таму ў гонар нас з Гінаю ў гатэлі, дзе мы спыняліся, быў узняты сцяг Беларусі. А наш сувенір (лялька-беларусачка, зробленая з валокнаў лёну) стаіць і цяпер у Мастацкім музеі вострава Пасхі.

**Пётр Рабко,** прадмесце горада Кансепсьён, Чылі

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11

**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

**E–mail:** golas_radzimy@tut.by

**Аб’ём выдання:** 1 друк. арк.

**Тыраж:** 1920, **Заказ:** 1097

**Час падпісання ў друк:** 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.

© “Голас Радзімы”, 2016